**Стратэгічныя накірункі дзейнасці ГА “Беларуская асацыяцыя журналістаў”**

**на 2015-2017 г.г.**

## ПРЭАМБУЛА

ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» (далей па тэксце — БАЖ) — добраахвотнае недзяржаўнае, непартыйнае аб’яднанне грамадзян, якія займаюцца прафесійнай журналісцкай дзейнасцю альбо садзейнічаюць яе развіццю.

ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» дзейнічае з 1995 г.

БАЖ садзейнічае рэалізацыі грамадзянскіх, эканамічных, сацыяльных, культурных і прафесійных правоў і законных інтарэсаў сяброў арганізацыі, іх творчаму самавыяўленню і росту прафесійнага майстэрства; стварэнню ўмоваў для забеспячэння свабоды слова і друку, права на бесперашкоднае атрыманне, захоўванне і распаўсюд інфармацыі; абароне правоў журналістаў і прынцыпаў свабоднай і прафесійнай журналістыкі.

Зараз на ўліку ў арганізацыі 1150 чалавек. Грамадскае аб’яднанне мае 5 арганізацыйных структур (рэгіянальных філій): Брэсцкую, Гомельскую, Лунінецкую, Маладзечанскую і Наваполацкую, — якія пастаўлены на ўлік мясцовымі органамі ўлады.

З 1997 г. БАЖ — асацыяваны сябра Міжнароднай Федэрацыі Журналістаў (IFJ), З 2013 г. БАЖ — поўны сябра Еўрапейскай Федэрацыі Журналістаў (EFJ). У 2014 г. ГА “БАЖ” стала часовым сябрам Міжнароднай асацыяцыі па абароне свабоды слова (IFEX).

У 2003 г. Сусветная асацыяцыя газет (WAN) узнагародзіла БАЖ Залатым пяром Свабоды (Golden Pen of Freedom prize). У снежні 2004 г. Еўрапейскі парламент уганараваў БАЖ прэміяй імя А. Сахарава «За свабоду думкі». У 2011 г. арганізацыя атрымала ўзнагароду Свабоды Атлантычнай Рады.

## УВОДЗІНЫ

Прапанаваны праект стратэгічных накірункаў развіцця арганізацыі базуецца на аналізе яе дзейнасці ў папярэдні перыяд (поспехі, праблемы, моцныя і слабыя бакі), а таксама знешніх выклікаў і пагрозаў.

У перыяд з 2012 па 2015 г.г. арганізацыя сутыкнулася з шэрагам выклікаў. Узнікла неабходнасць рэагавання на:

- змены ў закон “Аб СМІ”, якія пагоршылі ўмовы дзейнасці СМІ і журналістаў,
- крымінальны пераслед журналістаў і блогераў,
- практыку прыцягнення да адміністрацыйнай адказнасці журналістаў, якія супрацоўнічаюць з замежнымі СМІ без акрэдытацыі,
- выкарыстанне закона “Аб супрацьдзеянні экстрэмізму” для абмежавання свабоды выказвання і абарачэння інфармацыі.

Улады па-ранейшаму адмаўляліся ўзаемадзейнічаць з арганізацыяй, у тым ліку ў пытаннях паляпшэння ўмоў дзейнасці беларускіх журналістаў і доступу да інфармацыі.

Нягледзячы на жорсткія вонкавыя ўмовы, арганізацыя ў згаданы перыяд захавала ўстойлівасць і здолела арганізаваць сістэмную працу ў накірунках юрыдычнай падтрымкі, вядзення маніторынгу сітуацыі ў галіне СМІ, павышэння кваліфікацыі журналістаў, прасоўвання высокіх стандартаў і прынцыпаў прафесіі, правядзення кампаній салідарнасці, пашырэння і ўмацавання міжнароднага супрацоўніцтва.

Удзел у аналізе дзейнасці арганізацыі ў 2012-2015 г.г., а таксама ў стратэгічным планаванні дзейнасці на 2015-2017 г.г. бралі прадстаўнікі кіруючых органаў БАЖ, рэгіянальных філій, актывісты арганізацыі, міжнародныя эксперты.

## МЭТЫ І ПРЫЯРЫТЭТЫ ДЗЕЙНАСЦІ

**Галоўнай мэтай** дзейнасці БАЖ на 2015-2017 г.г. з'яўляецца пашырэнне прасторы для свабоды слова праз падтрымку якаснай, запатрабаванай у грамадстве журналістыкі і распаўсюду праўдзівай інфармацыі.

**Прыярытэтнымі накірункамі** дзейнасці арганізацыі будуць:

- адстойванне свабоды выказвання меркавання і права на атрыманне і распаўсюд інфармацыі,
- прафесійнае развіццё і падтрымка журналістаў,
- умацаванне арганізацыйнага патэнцыялу.

**Апісанне прыярытэтных накірункаў, вынікаў і ключавых відаў дзейнасці ў іх межах:**

### І. Адстойванне свабоды выказвання меркавання і права на атрыманне і распаўсюд інфармацыі

Чаканыя вынікі:

1. **Захаванне незалежнай журналістыкі ў краіне**

Ключавыя дзеянні:

- забеспячэнне прававой абароны і падтрымкі ў выпадку парушэнняў правоў (кансультацыі з боку юрыстаў, практычная дапамога, прадстаўленне інтарэсаў у судах, напісанне скаргаў),
- ініцыяванне і кансультаванне па пытаннях падпісання калектыўных працоўных дамоваў (распрацоўка праекта дамовы на аснове Працоўнага кодэкса і рэдакцыйных палітык, нарады з рэдактарамі, папулярызацыя лепшага досведу рэдакцый, абмеркаванне "кейсаў"),
- абарона інтарэсаў масмедыя ў стасунках з дзяржаўнымі, грамадскімі і камерцыйнымі структурамі (асабістыя сустрэчы, пісьмовыя звароты, скаргі, ініцыяванне перамоваў, кансультацый, сумесных круглых сталоў і іншых мерапрыемстваў),
- узаемадзеянне з дзяржаўнымі структурамі (парламент, Адміністрацыя прэзідэнта, міністэрствы, выканкамы і г.д.) праз асабістыя сустрэчы, персанальная праца з парламентарыямі, накіраванне прапановаў, ініцыяванне і ўдзел у сумесных мерапрыемствах, зладжаных па ініцыятыве

БАЖ ці арганізаваных Парламенцкай Асамблеяй АБСЕ, Саветам Еўропы, іншымі міжнароднымі інстытутамі,
- арганізацыя грамадскіх кампаній у падтрымку незалежнай журналістыкі,
- умацаванне кадравага патэнцыялу і фінансавай устойлівасці рэдакцый незалежных СМІ (арганізацыя навучання, стажыровак, інфармаванне пра магчымасці ўдзелу ў конкурсах падтрымкі).

**2. Факты парушэнняў права на свабоду слова і доступ да інфармацыі публічна агалошаныя і зафіксаваныя**
Ключавыя дзеянні:

- маніторынг фактаў парушэння права на свабоду слова і доступ да інфармацыі,
- распаўсюд інфармацыі пра зафіксаваныя факты парушэнняў: на сайце, у “Абажуры”, у спецыяльных выпусках бюлетэняў, у часе публічных мерапрыемстваў, праз адрасныя рассылкі,
- падрыхтоўка перыядычных і гадавых справаздач пра сітуацыю ў медыясферы,
- інфармаванне беларускай і міжнароднай супольнасці пра сітуацыю ў сферы свабоды слова ў Беларусі праз удзел сябраў і экспертаў БАЖ у міжнародных і нацыянальных канферэнцыях, слуханнях, працоўных сустрэчах і г.д.,
- правядзенне мерапрыемстваў у гонар калег, што асабліва вызначыліся ў адстойванні свабоды слова ці пацярпелі за прафесійную дзейнасць.

**3. Грамадзянская супольнасць, журналісты, міжнародныя арганізацыі і замежныя партнёры, а таксама актыўныя грамадзяне падтрымалі кампанію “За права на інфармацыю”**
Ключавыя дзеянні:

-Праца **з прадстаўнікамі дзяржструктур:** сустрэчы і перапіска, правядзенне круглых сталоў і сустрэч з прэс-службамі, прапановы па зменах у заканадаўства, стварэнне рэйтынгаў адкрытасці/закрытасці і інфармаванне пра іх вынікі прадстаўнікоў уладаў і інш.

-Праца **з журналістамі:** правядзенне семінараў, інфармаванне пра мэты і сутнасць кампаніі (праз сайт, “Абажур”, сацыяльныя сеткі, рассылку і г.д.), стварэнне прамацыйных пакетаў, збор подпісаў і інш.

-Праца **з прадстаўнікамі НДА:** звароты з прапановай далучэння да кампаніі, задзейнічанне іх рэсурсаў у распаўсюдзе інфармацыі, арганізацыя сумесных мерапрыемстваў, інфармацыйная падтрымка праектаў НДА ў сферы медыяграматнасці і інш.

-Праца **з грамадствам**: сустрэчы з чытацкімі аўдыторыямі на базе рэдакцый і філій, выданне інфармацыйных і прамацыйных матэрыялаў, маніторынг фактаў

прапаганды і маніпулявання грамадскай думкай, інфармаванне грамадскасці пра вынікі маніторынгу.

-Праца з **замежнымі партнёрамі**: напісанне зваротаў, арганізацыя слуханняў, круглых сталоў і іншых дыскусійных пляцовак, рэгулярнае інфармаванне пра сітуацыю, вывучэнне і папулярызацыя досведу замежных краін, удзел замежных экспертаў у мерапрыемствах, звязаных з кампаніяй і прадстаўнікоў БАЖ - у замежных мерапрыемствах.

**4. Падрыхтаваныя прапановы зменаў у заканадаўстве, накіраваныя на рэфармаванне медыясферы**
Ключавыя дзеянні:

- экспертыза дзеючага заканадаўства і практыкі правапрымянення,
- удзел экспертаў БАЖ у працы экспертных груп па рэфармаванні заканадаўства ў медыясферы,
- распрацоўка альтэрнатыўных праектаў/зменаў у прававых актах, прапаноў па зменах юрыдычнай практыкі ў медыясферы.

II. **Прафесійнае развіццё і падтрымка**

Чаканыя вынікі:

1. **Удасканаленне сістэмы павышэння кваліфікацыі журналістаў і рэдактароў**
   Ключавыя дзеянні:

- вызначэнне патрэбаў сябраў БАЖ у навучанні (анкеты, апытанні і г.д.),
- стварэнне персаніфікаванай сістэмы ўліку ўдзельнікаў адукацыйных праграм,
- стварэнне базы звестак пра трэнераў і экспертаў, якія могуць быць заангажаваныя ў навучальныя праграмы БАЖ,
- распрацоўка пакета адукацыйных прапаноў (курсаў, трэнінгаў, кансультацый), якія можа прадастаўляць БАЖ,
- рэалізацыя адукацыйных курсаў, трэнінгаў, кансультацый, якія адпавядаюць патрэбам сябраў БАЖ,
- рэгулярнае асвятленне вынікаў адукацыйных праграм і збор водгукаў пра іх (сайт, “Абажур”),
- адукацыйныя выезды экспертаў у рэдакцыі (in-house, майстар-класы),
- прэс-клубы і дыскусіі па журналісцкай этыцы і якаснай журналістыцы,
- асобная рубрыка на сайце БАЖ для асвятлення працы Камісіі па этыцы,
- навучанне медыяменеджменту (рэдакцыйнае кіраванне, выпрацоўка стратэгій развіцця рэдакцый, рэклама, сістэма распаўсюду, канвергентнасць),
- правядзенне прафесійных і творчых конкурсаў.

**2. Умацаванне сістэмы падтрымкі журналістаў, якія трапілі ў крытычныя сітуацыі**
Ключавыя дзеянні:

- рэгулярнае інфармаванне сябраў БАЖ пра механізмы атрымання прававой дапамогі,
- арганізацыя працы медыяюрыстаў у рэгіянальных структурах БАЖ,
- арганізацыя трэнінгаў па прававой тэматыцы для сябраў БАЖ,
- забеспячэнне доступу сябраў БАЖ да псіхалагічнай дапамогі праз кансультаванні з боку псіхолагаў,
- правядзенне псіхалагічных трэнінгаў,
- публікацыя парадаў псіхолагаў (сайт, “Абажур”).

## III. Умацаванне арганізацыйнага патэнцыялу

Чаканыя вынікі:

1. **Місію і стратэгічныя кірункі дзейнасці БАЖ ведаюць і падзяляюць сябры арганізацыі, яе партнёры**

Ключавыя дзеянні:

- напісанне і зацвярджэнне стратэгічнага плана развіцця арганізацыі да 2017 г.,
- распрацоўка і выраб прэзентацыйных матэрыялаў, якія ўтрымліваюць апісанне місіі, прыярытэтаў дзейнасці БАЖ,
- забеспячэнне ўдзелу сябраў БАЖ у абмеркаванні планаў развіцця арганізацыі (працоўныя сустрэчы, кірмашы ідэяў, сумеснае планаванне дзейнасці).

**2. Сябры БАЖ бяруць актыўны ўдзел у жыцці арганізацыі**
Ключавыя дзеянні:

- падрыхтоўка “Інструкцыі па карыстанні БАЖ”,
- “БАЖныя дні” для новых сябраў арганізацыі (прэзентацыя арганізацыі, інфармацыйны пакет для навічка, рассылка навічкам “вітальнай ноты”),
- высвятленне патрэбаў, збор прапановаў і водгукаў ад сябраў арганізацыі, звязаных з яе дзейнасцю (апытанні, сустрэчы, анкетаванне),
- стымуляванне ініцыятыў сябраў арганізацыі на ўзроўні філій і суполак (конкурс на лепшую філію года, падтрымка мясцовых і міжрэгіянальных мерапрыемстваў, навучанне актывістаў планаванню дзейнасці),
- стымуляванне ўдзелу сябраў БАЖ у прафесійных конкурсах, заснаваных БАЖ (асабістыя сустрэчы, публікацыі, рассылкі і г.д.),
- рэалізацыя сябрамі БАЖ уласных мясцовых і агульнанацыянальных ініцыятыў (клубы па інтарэсах, кампаніі, акцыі),

- развіццё добраахвотнай працы сябраў БАЖ (інвентарызацыя патрэбаў у дапамозе, стварэнне груп актывістаў-добраахвотнікаў пад канкрэтныя мерапрыемствы і праекты, навучанне гэтых людзей).

**3. Умацаванне філій і суполак арганізацыі і міжрэгіянальнага супрацоўніцтва**
Ключавыя дзеянні:

- рэгулярныя сустрэчы кіраўніцтва БАЖ і вядомых сябраў арганізацыі з сябрамі філій і суполак,
- перыядычныя сустрэчы кіраўнікоў і актывістаў філій і суполак,
- стварэнне міжрэгіянальнай інфармацыйнай сеткі (рассылка, групы ў Фэйсбуку),
- супольныя міжрэгіянальныя мерапрыемствы (прэс-туры, прэс-клубы, круглыя сталы, майстар-класы і г.д.),
- правядзенне традыцыйных карпаратыўных мерапрыемстваў, у тым ліку на конкурснай аснове (“БАЖынкі”, “БАЖны дзень”),
- візіты сябраў філій у іншыя рэгіёны для абмену досведам.

**4. Удасканаленне сістэмы камунікацыі**
Ключавыя дзеянні:

- развіццё сайта арганізацыі (публікацыя звестак пра кантакты людзей, якія адказваюць за канкрэтныя сферы дзейнасці арганізацыі; магчымасць падпіскі на рассылку; удасканаленне дызайна сайта, “хуткая сувязь з офісам БАЖ”),
- правядзенне рэгулярных сустрэч “грамадскай” рэдакцыі часопіса, прысвечаных сайту і “Абажуру” (вызначэнне прыярытэтнай тэматыкі, аўтараў г.д.),
- удасканаленне электроннай версіі часопіса “Абажур” для публікацыі на сайце (праз Issuu ці аналагічныя сэрвісы),
- далучэнне новых аўтараў да сайта БАЖ і “Абажура” з ліку сябраў БАЖ
- стварэнне элементаў электроннага офіса (агульны каляндар, агульныя дакументы і інш.),
- стварэнне міжрэгіянальнай рассылкі.

**5. Умацаванне матэрыяльнай базы арганізацыі і яе фінансавай устойлівасці**
Ключавыя дзеянні:

- абнаўленне аргтэхнікі і праграмнага забеспячэння,
- наяўнасць памяшкання для адукацыйных і працоўных сустрэч,
- аптымізацыя сістэмы сяброўскіх унёскаў у арганізацыі.

**6. Аптымізацыя сістэмы кіравання і арганізацыі працы офіса арганізацыі**
Ключавыя дзеянні:

- пераразмеркаванне абавязкаў і сфер адказнасці ў офісе,

- увядзенне пазіцыі выканаўчага дырэктара,
- арганізацыя рэгулярных планёрак супрацоўнікаў офіса і людзей, заангажаваных у каардынацыю ключавых накірункаў дзейнасці арганізацыі,
- аптымізацыя колькаснага складу кіруючых органаў арганізацыі,
- “замацаванне” сябраў кіруючых органаў арганізацыі за канкрэтнымі міжнароднымі партнёрамі і накірункамі,
- актуалізацыя ўліковай базы сябраў арганізацыі.

**7. Фармаванне пазітыўнага іміджу БАЖ**
Ключавыя дзеянні:

- стварэнне пакета прамацыйных матэрыялаў (буклет арганізацыі, візітоўкі, асадкі, каляндарыкі, блакноты, віншавальныя паштоўкі, відэаролік, торбачкі, значкі, кашулькі, стылізаваныя лагатыпы),
- абмеркаванне пытання пра змену лагатыпа арганізацыі,
- наладжванне інфармацыйнага партнёрства з арганізатарамі маштабных мерапрыемстваў (выставаў, фестываляў, канферэнцый, форумаў),
- стымуляваць з’яўленне матэрыялаў пра БАЖ і яго сяброў у СМІ,
- спецпраект “Чаму я ў БАЖ” на сайце арганізацыі (відэаінтэрв’ю, ролікі пра сяброў БАЖ),
- працяг праекта “БАЖная персона” на сайце,
- арганізацыя кампаніі да 20-годдзя БАЖ (серыя публікацый у СМІ, “Таймлайн”-гісторыя арганізацыі на сайце, юбілейная прэзентацыя-вечарына, выставы),
- праца па стварэнні віртуальнага музея беларускай незалежнай журналістыкі,
- традыцыйныя дабрачынныя акцыі БАЖ,
- творчыя вечарыны і сустрэчы з калегамі,
- творчыя конкурсы БАЖ,
- удзел у міжнародных журналісцкіх акцыях і кампаніях,
- праца з пасольствамі (прэс-сустрэчы, прэзентацыі, запрашэнні на мерапрыемствы).

**8. Умацаваныя партнёрскія сувязі БАЖ**

Ключавыя дзеянні:

- Удзел у сумесных праектах з МФЖ і ЕФЖ, IFEX, FOJO і інш.,
- Удзел у падрыхтоўцы сумесных дакладаў па правах чалавека і свабодзе слова з праваабарончымі беларускімі арганізацыямі,
- дапамога ў падрыхтоўцы і ўдзел у канферэнцыях, грамадскіх слуханнях і іншых мерапрыемствах ПАРЭ, АБСЕ, ААН і іншых міжнародных арганізацый, якія займаюцца пытаннямі свабоды слова.